**Кузнячэнка Т.**

# СПАЧАТКУ – РАДЗІМЕ

Расійскага пісьменніка з беларускімі каранямі Валерыя Казакова ў нас ведаюць добра: найперш па яго артыкулах ды кнігах, што ахвотна друкуюць беларускія выдавецтвы. У мінулым годзе, да прыкладу, у РВУ "Літаратура і мастацтва" пабачылі свет раманы "Цень гобліна" і "Халоп Найсвятлейшага Дэмакрата".

Акрамя таго, Валерый Мікалаевіч – адзін з пастаянных аўтараў часопіса "Нёман", прынамсі, традыцыйнага праекта "Сябрына": Беларусь – Расія". Вядомы пісьменнік і дзякуючы шматлікім асабістым сустрэчам. Дарэчы, наведаць школу, універсітэт ці працоўны калектыў, выступіць перад чытачамі В. Казакоў ніколі не адмаўляецца, бо асабліва цэніць і шчырую размову, і магчымасць сустрэцца з суайчыннікамі. А час? Будзе. Як прызнаўся ў адным з інтэрв'ю "Нёману" В. Казакоў, "калі ты пісьменнік, то час для пісьменства заўсёды знойдзецца.<...> атрымліваецца, што чым больш працуеш, чым менш зашорваешся, тым больш магчымасцей і часу для творчасці". І чарговай нагодай завітаць у беларускую сталіцу стала XX мінская Міжнародная кніжная выстаўка.

**– Валерый Мікалаевіч, якія вашы планы наконт выстаўкі?**

– Я чакаю сапраўднага кніжнага фэсту, свята друку, умацавання месца Беларусі як адной з буйнейшых выдавецкіх краін Еўропы. Аднак, у прынцыпе, я не вельмі люблю кніжныя выстаўкі, бо гэта свята кнігавыдаўцоў і гандляроў. Асабліва гэта адчуваецца ў Расіі. Не памятаю ніводнай выстаўкі, каб творцу нешта дасталося, – яны там як атрыбут. У Беларусі не так, бо ў вас ёсць дзяржаўная палітыка ў галіне культуры, ідэалогіі і друку. Вельмі рады, што ў выстаўцы будзе прымаць удзел Юрый Палякоў, галоўны рэдактар "Литературной газеты" і адзін з найлепшых сучасных расійскіх пісьменнікаў, а таксама шмат маіх сяброў па творчым цэху.

**– Якія сюрпрызы вы рыхтуеце беларускім чытачам?**

– Мяркую ў гэтым годзе выдаць два раманы: "Гапоны" і "Шэрая плошча". І выдам іх спачатку на радзіме, у Беларусі, а потым ужо аддам расійскім друкарам.

***Кузнячэнка, Т. Спачатку — Радзіме : [пра творчасць Валерыя Казакова, пісьменніка, ураджэнца в. Гарбавічы Чавускага раёна] / Таццяна Кузнячэнка // Літаратура і Мастацтва. — 2013. — 1 лютага — С. 3 : фота.***